# Вучыцца толькі на „выдатна“

## (На сустрэчы тав. ГАЛАДЗЕДА з піонерамі Варашылаўскага раёна)

Да сустрэчы з дарагім госцем, старшынёй Соўнаркома БССР тав. Н.М. Галадзедам рэбята рыхтаваліся даўно. І задоўга да вызначанага часу дзіцячы кіно-тэатр быў перапоўнен школьнікамі. У зале і ў файе мільгалі чырвоныя гальштукі, звінелі бадзёрыя, жыццерадасныя дзіцячыя галасы.

Бурнымі апладысментамі сустракаюць дзеці тав. Галадзеда. Сход адкрывае 12-гадовая піонерка з 23 яўрэйскай школы Люба Рубіна. Першыя словы яна прысвячае лепшаму другу совецкай дзетвары — таварышу Сталіну. Люба гаворыць аб сталінскіх школах, палацах, кіно, аб ўсім тым, што большэвіцкая партыя і совецкі ўрад далі дзецям сталінскай эпохі.

—Радасці няма канца. Дзякуем таварышу Сталіну за шчаслівае дзяцінства,—пад бурныя апладысменты заяўляе Рубіна. —Мы любім нашых правадыроў. Мы хочам ведаць пра іх. Просім тав. Галадзеда расказаць пра Надзвычайны З'езд Советаў, пра Канстытуцыю і яе творца таварыша Сталіна.

Нікалай Матвеевіч пачынае свой просты, зразумелы для дзетвары расказ з прамовы таварыша Сталіна на VIII Усесаюзным З'езде Советаў аб унясенні змен у старую Канстытуцыю, расказвае аб выключнай ролі таварыша Сталіна ў стварэнні новай Канстытуцыі. Новая Канстытуцыя ў літаральным сэнсе слова напісана рукой таварыша Сталіна.

Тав. Галадзед падрабязна растлумачвае паасобныя артыкулы Канстытуцыі, супастаўляе сучаснае з мінулым. Пераходзячы да 121 артыкула Нікалай Матвеевіч гаворыць аб тых велізарных абавязках, якія ўскладае Канстытуцыя на падрастаючае пакаленне. Яно павінна быць высокаадукаваным і культурным.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы